*А.М. Макарэвіч*

# ЛІТАРАТУРНЫЯ ЖАНРЫ І ІХ МАДЫФІКАЦЫІ: ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

Сучаснае літаратуразнаўства – беларускае, рускае, украінскае, польскае – у апошняе дзесяцігоддзе актыўна даследуе спецыфіку адлюстравання рэчаіснасці ў межах пэўных жанраў і іх мадыфікацый, формаўтваральныя перакрыжаванні, стыль жанравых форм і інш. праблемныя пытанні жаналогіі. Змест такіх даследаванняў, праблемы, акрэсленыя і вырашаемыя ў іх, пастаўленыя на перспектыву пытанні – усё гэта сведчыць пра тое, што жанралогія становіцца неад'емнай часткай вывучэння спецыфікі мастацкага мыслення пэўнага аўтара і пісьменнікаў адпаведнай літаратурнай эпохі, канкрэтнага індывіда, групы людзей і грамадства ў цэлым у лакальнай часавай і геаграфічнай прасторы. Стыль літаратурных жанраў і іх мадыфікацый – гэта не толькі трансфармаваныя формы мыслення эпохі, але і паказчыкі спецыфікі такога мыслення, структурнага, сэнсавага і стылёвага дамінавання ў ім.

У той жа час літаратурныя жанры, асабліва на мяжы XX – XXI стст., маюць у сабе патэнцыяльную здольнасць да супрацiўлення тым ці іншым класіфікацыям[1]. Гэта, відаць, з'яўляецца прычынай таго, што кожную новую мадыфікацыю аднаго і таго ж жанру даследчыкі схільныя разглядаць як асобны жанр са сваёй сістэмай сэнса-, форма- і стылеўтварэння. У такім выпадку паўстае праблема абсалютнага пашырэння жанравых класіфікацый: паколькі жанр з характэрным для яго стылем – гэта адна з форм мастацкага мыслення (а яно мае тэндэнцыю да абсалютнага разнявольвання), то іх, жанраў, як і форм мыслення, можа быць "бясконца" многа. Як вынік гэтага паўстае наступнае пытанне. Ці мае сэнс грунтоўнае даследаванне індывідуальнага стылю

---

[1] Аб гэтым больш падрабязна ў кантэксце літаратуразнаўчых высноў гл.: ***Макарэвіч А.М.*** Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX стст. – Магілёў: Выд-ва Магілёўскага дзярж. ун-та імя А.А. Куляшова, 1999. – С. 5-6.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пісьменніка, стылю жанру і яго мадыфікацый, структуры твора і стылю яго формаўтваральных элементаў ва ўмовах "бясконцай" шматжанравасці? Калі мець на ўвазе, што жанр – гэта сістэма, то адказ на такое пытанне можа быць адмоўным: даследаванне вышэй названых аспектаў можа ператварыцца ў самамэту, яго вынікі будуць мець схаластычны змест.

У сувязі з гэтым можна звярнуць увагу на такі аспект: выяўленне агульнага і адметнага мэтазгодна праводзіць у межах сістэм, падобных паводле законаў іх функцыянавання. Пры гэтым важна выкарыстоўваць тэрміны, пазбаўленыя шматзначнасці і патэнцыяльнай закладзенасці іх розначытання. У рэцэпцыйнай свядомасці ў такім выпадку павінны ўзнікаць адпаведныя градацыі: сістэма, яе прызначэнне, складальнікі, умовы і працэс іх функцыянавання, успрыняцце гэтай сістэмы і да т.п. Так, напрыклад, параўнанне жоўтага, чырвонага і зялёнага "колераў" святлафора паводле знешніх праяў, спецыфікі функцыянавання і прызначэння з такімі ж "колерамі" іншых сістэм ці проста з колерамі як такімі (афарбоўка, кампаненты палітры і пад.), відаць, не мае канцэпцыйнага сэнсу.

Такія паралелі можна спраецыраваць на працэс даследавання літаратурных жанраў, якія ў XX – XXI стст. часцей за ўсё не вызначаюцца пастаянствам у адносінах да структурных канонаў. У жанравых сістэмах узніклі падсістэмы, адбываецца працэс формаўтваральнага і стылёвага перакрыжавання, міжжанравых запазычанняў і інш. Аднак пры гэтым агульныя законы жанравай сістэмы захоўваюцца, у іншым выпадку яна б разбурылася. Калі мець на ўвазе апошнія высновы, то варта прызнаць неабходнасць даследавання не толькі стылю твора, пісьменніка, літаратурнага перыяду, літаратурнай эпохі, але і стылю жанру і яго мадыфікацый[2] як паказчыка стылю мыслення не толькі мастака, але і прататыпнай Я-свядомасці адпаведнай эпохі.

І сапраўды, у сучасным літаратуразнаўстве актыўна даследуюцца формы адлюстравання пэўных праяў грамадскага мыслення і дзеяння. Аднак сэнсавая неадназначнасць, а то і шматварыянтнасць жанразнаўчых вызначэнняў ва ўмовах так званай шматжанравасці прыводзіць часам да рэцэпцыйнага непаразумення. У такой сітуацыі, каб прасачыць законы развіцця

---

[2] Аб гэтым больш падрабязна гл.: ***Макарэвіч А.М.*** Праблема жанравых мадыфікацый... – С. 158.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жанру як сістэмы ў межах сістэмы больш высокага парадку (творчасць пісьменніка, перыяд развіцця літаратуры, нацыянальнае прыгожае пісьменства), каб параўнаць асаблівасці такога развіцця і вынікі яго ўзаемадзеяння з іншымі сістэмамі, неабходна мець на ўвазе менавіта *сістэму*, а не асобныя праявы яе, вылучаючы іх (тэарэтычна) у "бясконцае" мноства.

У дадзеным выпадку праблема не ў тым, адносіць, напрыклад, мініяцюру да асобнага жанру ці жанравай мадыфікацыі апавядання; праблема тут метадалагічнага плана: даследаваць такую літаратурную форму як асобную сістэму ці ўсё ж як падсістэму са сваімі формаўтваральнымі асаблівасцямі, што складваліся ў адпаведнасці з законамі сістэмы, у межах якой пэўная літаратурная форма ўзнікла і ў кантэксце праяў якой яна функцыяніруе, узаемадзейнічае, спрыяючы ўзнікненню новых праяў, што, аднак, не супярэчыць законам сістэмы, на прасторах якой усё гэта адбываецца.

Пры такіх умовах, думаецца, варта весці гутарку пра жанры, іх мадыфікацыі і формы жанравай мадыфікацыі.

*Жанравая мадыфікацыя* – гэта першы жанравы ўзровень, які паводле агульнай формы і дамінуючага стылю не супярэчыць характэрным прынцыпам адлюстравання рэчаіснасці ў межах адпаведнага жанру (напрыклад, абразок як мадыфікацыя жанру апавядання).

*Форма жанравай мадыфікацыі* – другі жанравы ўзровень, для якога характэрна спалучэнне паказальных рысаў розных мадыфікацый з адначасовым дамінаваннем прыкмет той ці іншай мадыфікацыі (формаўтваральнае ў межах жанру і жанравай мадыфікацыі перакрыжаванне; напрыклад, *жанр* – апавяданне, *жанравая мадыфікацыя* – абразок, *форма жанравай мадыфікацыі* – спалучэнне ўласцівасцей абразка і апавядальнай гісторыі з дамінаваннем асаблівасцей абразка = абразок / апавядальная гісторыя[3]).

---

[3] Формаўтваральнае ў межах жанру і жанравай мадыфікацыі перакрыжаванне характэрна, напрыклад, для твораў Я. Коласа: яго "карцінак з натуры" – аўтарскае вызначэнне (*сцэна з натуры / падзейна-разгорнутае апавяданне / навела / апавядальная гісторыя*), апавядання "Кантракт" (*замалёўка / навела / падзейна-разгорнутае апавяданне*), твораў З. Бядулі ("Тулягі", "Ліст"), М. Гарэцкага ("Дзве сястры"), М. Багдановіча ("Несчастный случай") – *падзейна-разгорнутае апавяданне / навела*; формаўтваральныя перакрыжаванні ў творах з "Мініяцюр" і "Абразкоў" З. Бядулі: *мініяцюра / імпрэсія / экспрэсія / абразок*.

Адзін з варыянтаў жанравых узроўняў прадстаўлены ў схеме № 1.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Жанравыя мадыфікацыі і іх формы – гэта вынік своеасаблівага двухпланавага бачання рэчаіснасці пісьменнікам: успрыняцця і асэнсавання яе ўласна Я-свядомасцю і пераўвасобленай (Я-свядомасцю мяркуемага літаратурнага героя). Паколькі літаратурны вобраз – гэта вынік дзейнасці Я-свядомасці пісьменніка, то формаўтваральныя асаблівасці твора – гэта асаблівасці бачання Я-свядомасцю пісьменніка рэчаіснасці праз пэўныя формы яе праламлення, якія здольныя адлюстроўваць рэчаіснасць у шматварыянтнасці яе ўспрыняцця. Інакш кажучы, пісьменнік, арыентуючыся на мастацкае адлюстраванне пэўнага кшталту грамадскай свядомасці праз паказ свядомасці адпаведных літаратурных герояў, становіцца на шлях пераўвасаблення ўласнай свядомасці[4]. Гэта значыць, што стваральнік пэўнага мастацкага свету ўспрымае прататыпную рэчаіснасць ці мадэлюе яе ў адпаведнасці з патэнцыяльнымі магчымасцямі і жаданнямі сваёй мастацкай фантазіі, якая здольна трансфармаваць Я-свядомасць пісьменніка ў Я-свядомасць мяркуемага літаратурнага героя. І Я-свядомасць пісьменніка, часова трансфармуючыся ў Я-свядомасць патэнцыйнай дзеючай асобы з будучага твора, успрымае мадэлюемую для такога твора рэчаіснасць "вачыма" свядомасці ўжо гэтай самай дзеючай асобы. Форма "ўспрыняцця" пры гэтым нараджае і форму ўзнаўлення, якая вылiваецца затым з дапамогай пэўных структура- і стылеўтваральных сродкаў у адпаведную мадыфікацыю таго ці іншага жанру. Філасофскія, псіхалагічныя, грамадзянскія ўстаноўкі так званага абстрактнага аўтара спрыяюць нараджэнню не толькі формы, але і стылю ўсіх жанравых узроўняў.

Жанравыя формы і іх мадыфікацыі – гэта адпаведныя формы адлюстравання жыцця, якое "ўспрымаецца вачыма" трансфармаванай і адаптаванай да Я-свядомасці літаратурнага героя Я-свядомасцю пісьменніка. Жанравая мадыфікацыя з яе сэнсава- і структураўтваральнымі асаблівасцямі з'яўляецца пры гэтым востравам злучэння рэальнай і пераўвасобленай свядомасці пісьменніка (схема 2).

Прадстаўленыя ў даведачна-тэарэтычных крыніцах жанравыя класіфікацыі (а яны павінны ўлічваць і адлюстроўваць тэндэнцыі, дасягненні, прызнаныя вынікі прыватных даследаванняў) вызначаюцца некаторай ступенню супярэчнасцей, якія,

[4] У дадзеным выпадку можна правесці паралель з прапанаванымі высновамі В. Шміда аб абстрактным аўтары, "*індэксамі абстрактанага аўтара*", якія "*здзяйсняюць задуму аўтара*" [18. С. 76–77] і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

аднак, ва ўкраінскім і рускім тэарэтычным літаратуразнаўстве паступова ліквідуюцца.

Паказальнай у гэтых адносінах з'яўляецца праблема ўключэння ў тую ці іншую класіфікацыйную нішу эпапеі, хронікі, мемуараў і інш.

Так, напрыклад, ва ўкраінскім тэарэтычным літаратуразнаўстве *эпапея* вызначаецца *як* асобны *жанр* у вялікіх эпічных жанрах [3, схемы 18, 20, с. 471, 472], а *хроніка*[5] як *жанравая разнавіднасць рамана па форме* [3, схема 21. С. 473]; адны рускія тэарэтычныя крыніцы адносяць *эпапею да жанравай разнавіднасці рамана* [2. С. 513], другія – *да асобнага жанру*[6] [5, сл. 1238], звярнуўшы пры гэтым увагу на аднясенне эпапеі ў некаторых выпадках да жанравай разнавіднасці рамана[7] [5, сл. 1236].

Супярэчнасць жанравых вызначэнняў і характарыстык назіраецца і ў беларускім літаратуразнаўстве; яе можна прасачыць на прыкладзе тэрміналагічных неадпаведнасцей пры вызначэнні жанравых мадыфікацый рамана.

Аўтар "Тэорыі літаратуры ў тэрмінах", імкнучыся, відаць, прадстаўніча адлюстраваць жанравыя вызначэнні з прыватных літаратуразнаўчых даследаванняў, у той жа час апасродкавана паказаў бессістэмнасць такіх вызначэнняў у адносінах да рамана, хронікі, эпапеі. Так, напрыклад, "Палеская хроніка" І. Мележа і "*цыкл ваенных раманаў*" І. Чыгрынава ў гэтай крыніцы вызначаюцца то як хроніка [13. С. 342], то як найбліжэйшы падыход да напісання эпапеі [13. С. 263], то як "*спроба стварыць беларускую літаратурную Э<папею>*" [13. С. 359]; раман У. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім" у адным выпадку вызначаецца як "*узор гістарычнага рамана, які сваёй мастацкай сутнасцю набліжаецца да эпапеі*" [13. С. 263], у другім – як "*спроба стварыць беларускую літаратурную эпапею*"

---

[5] Хроніка – у кантэксце гэтых даследаванняў – маецца на ўвазе хранікальная форма эпічных твораў XIX – XX стст.

[6] "Художественные произведения *Э<попеи> 19 – 20 вв. объединяют ее в одну художественную категорию с новеллой и романом <...> К жанру эпопеи можно отнести «Жизнь Клима Самгина» М. Горького, «Тихий Дон» (1928 – 40) М.А. Шолохова, трилогии «О Сноупсах» (1940 – 59) У. Фолкнера, «Семью Тибо» (1929 – 40) Р. Мартена дю Гара. <...> Э<попея> – один из самых трудных и очень редких жанров*" [5, сл. 1238].

[7] "Существенно различаются между собой древние (и средневековые) героическая Э<попея> и Э<попея> Нового времени, к которой иногда приписывают термин «роман-эпопея»" [5, сл. 1236].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[13. С. 359]. Такія вызначэнні не выклікаюць здзіўлення, бо ў іх адлюстраваны супярэчнасці жанравых аднясенняў, прадстаўленыя ў асобных манаграфіях.

Так, напрыклад, “Палеская хроніка” на старонках аднаго і таго ж даследавання вызначаецца то як “*мастацкая хроніка пра Палессе*”, то як “*гістарычная хроніка*” паводле фактычнага матэрыялу, то як “*палеская эпапея*”, то як жанр “*сацыяльна-псіхалагічнага рамана*” [6, адпаведна: с. 193, 195, 197, 199].

І зусім расплывістыя жанравыя вызначэнні “Палескай хронікі” І.Мележа, зробленыя І.Я.Навуменкам у акадэмічным выданні “Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.” у наступным кантэксце: “*Раманы І.Мележа “Людзі на балоце” і “Подых навальніцы” таксама своеасаблівы эпас*[8]. <...>, *ён* [І. Мележ – А.М.] *доўга шукаў працягу “Палескай хронікі”, якая б налічвала пяць або шэсць раманаў. Нават умоўныя назвы былі: “За асакою бераг”, “Звер сочыць з зарасніку”. <...> Эпапеі з задумы Мележа не атрымалася. Эпапея – толькі дзве першыя кнігі. Сама эпоха пераводзіла эпапейнае жыццё калгаснай вёскі ў штосьці новае*” [10. С. 590, 594, 595]. Падобнае расплывістае жанравае вызначэнне – не адзінкавы прыклад у названым выданні, патэнцыяльнай асаблівасцю артыкулаў якога павінна быць адлюстраванне не толькі пункту погляду іх аўтараў, але і сукупнасці навуковых поглядаў на праблемы гістарычнага і тэарэтычнага характару.

Там, дзе ёсць складанасць жанравага аднясення (а яно павінна адбывацца на падставе грунтоўнага формаўтваральнага і стылёвага аналізу), там узнікаюць неадпаведнасці і супярэчнасці ў жанразнаўчых высновах. Такія супярэчнасці назіраюцца таксама і ў даследаваннях па тэорыі і гісторыі жанравага развіцця апавядання, аповесці, рамана.

Так, напрыклад, мініяцюра, раман-пародыя вызначаюцца і характарызуюцца як асобныя літаратурныя жанры (адпаведна: [4], [7]), сустракаюцца неадпаведнасці ў жанравых вызначэннях і характарыстыках мемуарнай літаратуры[9], двухсэнсоўнасць і невыразнасць у адносінах да вызначэння “жанравай разнавіднасці” лірычнага рамана ў спадчыне Я. Брыля [11], формаўтваральных у межах жанру перакрыжаванняў [14], аповесці М. Зарэцкага “Голы звер” (“жанр сатырычнай аповесці” [12. С. 7]) і

[8] Аўтар, відаць, меў на ўвазе эпічны змест твораў – А.М.

[9] Аб гэтым – [9].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

інш. Прыкладамі няўдалага аб'яднання зместа- і формаўтваральных паказчыкаў пры вызначэнні жанравай прыналежнасці твора могуць быць высновы адносна “Лабірынтаў” В. Ластоўскага (“*філасофска-культуралагічная ўтопія*” [1. С. 13]), адносна “*жанру навуковай фантастыкі*” “*як спосаба для раскрыцця людскіх праблем і гераічных памкненняў*” у адным “*з найлепшых апавяданняў Шыціка – “Трансплутонавыя афеліі*” [8. С. 171] і інш. У той жа час перспектыўнымі (у акрэсленым тут праблемным кантэксце), хоць і не пазбаўленымі некаторых супярэчнасцей, з'яўляюцца працы беларускіх даследчыкаў Т.Г. Сіманавай [15], В.М. Стральцовай [16, 17] і інш.

Нават гэтыя каротка акрэсленыя жанразнаўчыя праблемы сведчаць пра тое, што даўно наспела неабходнасць стварэння ў беларускім літаратуразнаўстве не толькі гісторыі жанравага развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства, але і гісторыка-тэарэтычнага даведніка па жаналогіі – крыніц, якія б, з аднаго боку, па магчымасці поўна адлюстроўвалі пытанні і праблемы станаўлення, развіцця і ўзвышэння беларускага жанразнаўства ў кантэксце сусветнага, з другога, прадстаўлялі мадэль жанравага развіцця нацыянальнай літаратуры – мадэль, якая б адлюстроўвала не толькі напрацоўкі аднаго аўтара ці калектыву, але і аб'ядноўвала ў сабе шырокі спектр поглядаў, высноў, канцэпцый розных жанролагаў, даследчых калектываў.

*Схема 1*

**Жанравыя мадыфікацыі, іх формы і стыль**




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Умоўныя абазначэнні:

**I** – <..> – мадыфікацыі пэўнага жанру;

**I.Ф-1** – <..>.**Ф** – формаўтваральныя блокі мадыфікацыі, якія ўзаемадзейнічаюць у межах формаўтваральнага поля; спалучэнне іх нараджае жанравую форму, для якой характэрна альбо формаўтваральнае адзінства (*сукупнасць* формаўтваральных блокаў, напрыклад, *апавядальных гісторый* ці *наяўнасць* толькі *аднаго блока*: *апавядальнай гісторыі*), альбо формаўтваральнае перакрыжаванне з дамінаваннем прыкмет той ці іншай мадыфікацыі: апавядальная гісторыя / абразок;

**I.С** – <..>.**С** – стыль жанравай мадыфікацыі як вынік узаемадзеяння ў межах стылеўтваральнага поля стылёвых прыкмет формаўтваральных блокаў мадыфікацыі.

**ФП** – формаўтваральнае поле.

**СП** – стылеўтваральнае поле.

*Схема 2*

**Ад формы ўспрыняцця да формы адлюстравання**




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Літаратура:**

1. *Барысенка В.У.* Творчасць В. Ластоўскага ў ідэйна-мастацкім кантэксце беларускай літаратуры пачатку XX ст. / Аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук / Беларускі дзярж. ун-т. – Мінск, 2000.
2. *Богданов В.А.* Роман // Литературный энциклопедический словарь / Под общ. ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. – М., 1987.
3. *Галич О., Назарець В., Васильєв Є.* Теорія літератури / За наук. ред. О. Галича. – Київ, 2001.

4. *Кісліцына Г.М.* Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры. – Мінск, 2000.
5. *Кожинов В.В.* Роман // Литературная энциклопедия терминов и понятий / Под ред. А.Н. Николюкина. Ин-т науч. Информации по общественным наукам РАН. – М., 2003.
6. *Кулешов Ф.И.* Подвиг художника: Лит. путь И. Мележа. – 2-е изд. – Минск, 1982.
7. *Ляшенко А.В.* Роман-пародия как жанр // Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе (проблемы теоретической и исторической поэтики): Материалы междунар. науч. конф.: В 2-х ч. – Ч. 2 / Под ред. Т.Е. Автухович. – Гродно, 2000.
8. *Макмілін А.* Беларуская літаратура ў 50–60-я гады XX стагоддзя. – Мінск, 2001.
9. *Мурнаев А.Ю.* О проблеме терминологического определения жанра мемуарной литературы // Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе (проблемы теоретической и исторической поэтики): Материалы междунар. науч. конф.: В 2-х ч. – Ч. 2 / Под ред. Т.Е. Автухович. – Гродно, 1998.
10. *Навуменка І.Я.* Іван Мележ // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4-х т. – Т. 3 / Нац. Акад. Навук Беларусі. Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск, 2002.
11. *Нікіфарава В.* Лірычны раман у творчасці І. Буніна і Я. Брыля // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: Матэрыялы IV Міжнар. навук. канф. (Мінск, 12–14 кастр. 1999 г.): У 2-х ч. – Ч. 1 / Рэдкал.: С.Я. Ганчарова-Грабоўская і інш. – Мінск, 2000.
12. *Падстаўленка В.Ф.* Жанрава-стылёвыя асаблівасці беларускай сатырычнай прозы 20–30-х гадоў XX ст. / Аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук / Беларускі дзярж. ун-т. – Мінск, 2004.
13. *Рагойша В.П.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. – Мінск, 2001.
14. *Рагойша П.В.* Жанрава-стылёвыя асаблівасці рамана Сяргея Пясецкага "Каханак Вялікай Мядзведзіцы" // Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе (проблемы теоретической и исторической поэтики): Материалы Междунар. науч. конф.: В 2-х ч. – Ч. 2 / Под ред. Т.Е. Автухович. – Гродно, 2000.
15. *Симонова Т.Г.* Мемуары-хроника: специфика жанра, роль в литературном контексте // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: Матэрыялы У Міжнар. навук. канф., прысвечанай 80-годдзю БДУ (Мінск, 16 – 18 кастр. 2001 г.): У 3-х ч. – Ч. 2: Теоретические проблемы литературоведения. Мировая литература: проблемы взаимодействия и взаимосвязей / Рэдкал.: С.Я. Ганчарова-Грабоўская і інш. – Мінск, 2001.
16. *Стральцова В.М.* Агульныя прынцыпы жанравай кадыфікацыі аўтабіяграфічных твораў // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: Матэрыялы V Міжнар. навук. канф., прысвечанай 80-годдзю БДУ (Мінск, 16–18 кастр. 2001 г.): У 3-х ч. – Ч. 2 / Рэдкал.: С.Я. Ганчарова-Грабоўская і інш. – Мінск, 2001.
17. *Стральцова В.М.* Шлях да сябе: Сучас. аўтабіяграф. проза як маст. сістэма. – Мінск, 2002.
18. *Шмид В.* Нарратология. – М., 2003.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова